*У. Ф. Красюк,*
*дацэнт кафедры філасофіі*
*Беларускага дзяржаўнага*
*ўніверсітэта культуры і мастацтваў,*
*кандыдат філасофскіх навук*

# НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ІДЭНТЫЧНАСЦЬ БЕЛАРУСАЎ – ПРАЕКЦЫЯ Ў XXI СТАГОДДЗЕ

Глабалізацыйныя працэсы сучаснасці ставяць перад кожным суцэльным грамадствам пытанне аб праекцыях яго далейшага развіцця. Уніфікацыя і стандартызацыя грамадскіх зносін, аб'ектыўна садзейнічаюць анігіляцыі своеасаблівых і арыгінальных спосабаў быцця гістарычна сфарміраваных этнасаў. Пашырэнне масавай культуры, вестэрнізацыя, інфармацыйныя клішэ задаюць кірунак для страты гістарычных каранёў народнага жыцця, стварэнню новых мадэляў духоўнай генерацыі і запатрабаваных артэфактаў, што кардынальна змяняе сутнасны стрыжань нацыянальнага аблічча. Змяняюцца цывілізацыйныя нормы сувязі паміж соцыумамі. Складу грамадскага працэсу надаюцца розныя нетрадыцыйныя зместы. Культура і сама культуратворчасць дыферэнцуюцца, галінуюцца, папаўняючыся раней невядомымі прыёмамі. Адбываецца пераацэнка каштоўнасцей.

У 1922 г. У. Огбарн уводзіць у навуковы абыходак паняцце «культурнае спазнанне». Культурнае спазнанне мае месца тады, калі духоўная культура не паспявае прыстасавацца да развіцця культуры матэрыяльнай, якая вырываецца наперад. Пачатак XXI ст. сведчыць, што нягледзячы на эканамічныя крызісы і супярэчнасці пераход да постіндустрыйнай цывілізацыі забяспечвае небывалы ўздым матэрыяльнага патэнцыялу, дзе нават інфармацыйны бум, вытворчасць ведаў служаць у сваім прызначэнні забеспячэнню матэрыяльнага дабрабыту. «Трэцяя хваля» А. Тофлера глабалізуе навукова-тэхнічныя і цывілізацыйна-культурныя дасягненні. Сацыяльныя і інфармацыйныя камунікацыі ствараюць кроскультурную прастору, якая вядзе да ўніфікацыі культуратворчых працэсаў. Нягледзячы на ўпэўненасць С. Ханцінгтона адносна захавання міжцывілізацыйных адрозненняў, ёсць рэальная перспектыва не толькі дыфузіі, але і страты культурных адметнасцей этнасаў, што, у сваю чаргу, негатыўна адаб'ецца на развіцці сусветнай культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Таму ўзнікае натуральнае пытанне аб небяспецы спазнення ў асэнсаванні тых праблем, якія нясе з сабою дынаміка глабалізацыйных працэсаў. Адна з іх – захаванне нацыянальнай ідэнтычнасці як сродку функцыянавання і развіцця ўнікальнасці культур розных народаў. Для беларускага народа гэта асабліва актуальна, бо, жывучы ў цэнтры Еўропы, на перакрыжаванні цывілізацыйных шляхоў, ёсць небяспека страціць у вадавароце падзей тыя жыватворныя крыніцы, якія жывяць нацыянальную культуру, яе духоўны змест.

На першы план выходзіць праблема ідэнтыфікацыі як вышэйшай формы сацыялізацыі, як спосабу атаясамлівання сябе ў якасці феномена з гістарычна выпрацаванымі каштоўнасцямі. Праз ідэнтыфікацыю раскрываюцца сацыяльная і духоўна-псіхалагічная матывацыі быцця народа і асобы.

Феномен ідэнтыфікацыі мае гістарычнае паходжанне. Ён не назначаецца па загаду, не ствараецца штучна. Ідэнтыфікацыя прарастае па меры атаясамлівання чалавека толькі з тым, што для яго ўяўляе яго ж асабістую сутнасць, гэта значыць той этнагістарычны асяродак, які з'яўляецца вынікам і аб'ектыўных абставін стварэння, і культурнага самасцвярджэння.

Ідэнтыфікацыя эксплікуе неабходнасць разумення і асэнсавання глыбіні сацыяльнай быційнасці – тых гістарычных каранёў, што вызначылі сённяшні стан багацця і святынь культуры народа. Зберагчы ідэнтычнасць азначае захаваць падмуркі сацыяльнасці, культуры, духоўнасці, забяспечыць пераемнасць традыцый, сувязь эпох. Так, для беларусаў наяўна актуальным з'яўляецца ўключэнне ў бягучае і будучыню, напрыклад, сваёй традыцыі рэлігійнага пагаднення, верацярпімасці, шанавання продкаў. Гэта азначае, што трэба вучыць моладзь жыць station – trэба вучыць моладзь жыць станоўча засвоеным мінулым так, каб яно было сегментам сучаснасці і мела вектар накіраванасці ў будучыню. Канфесійнае паразуменне – залог цэласнасці нашай культуры.

Гісторыя сведчыць – народы гінуць таму, што страчваюць адчуванне саміх сябе, людзі набываюць бессэнсоўнасць свайго існавання ў якасці членаў дакладнай супольнасці; этнічнае поле страчвае духоўную ўстойлівасць. І справа не ў сацыяльна-духоўнай пасіўнасці. Наадварот, мы «пачынаем выпрацоўваць больш гісторыі, чым можам пераварыць, ці такую, каторая, супярэчыўшы нашай гістарычнай сутнасці, у такой якасці проста не можа быць намі асвоена ці асвоена без вялікіх патрасенняў нашай гісторыі і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нашай душы» [1, с. 43]. Таму сацыяльная актыўнасць этнаса павінна накіроўвацца на ўмацаванне каштоўнасна-ідэнтыфікацыйнага стрыжня сацыяльнай культуры – гэтага сэнсавага цэнтра быцця.

Возьмем, напрыклад, асэнсаванне сваёй духоўна-культурнай ідэнтычнасці ў плане нацыянальных традыцый рэлігійнага мастацтва. Нягледзячы на канфесійныя адрозненні, у цэлым можна выдзеліць агульныя рысы. Рэлігійнае мастацтва арыентавана не толькі на «горняе», але і на «дольняе», гэта значыць на тое рэальнае асяроддзе, у якім віруе нацыянальнае жыцце. Яно прыцягвае да сябе людзей, стварае падмуркі салідарнасці, духоўнай еднасці. Як сапраўднае мастацтва, яно ўмацоўвае і агульначалавечыя каштоўнасці, і ментальнасць людзей, якія жывуць дакладным сацыяльным арганізмам у межах адной нацыі. Разумеючы мастацтва мінулага, мы больш глыбока пазнаём сучаснасць і ўглядаемся ў будучыню. Для гэтага наш сучаснік павінен, нягледзячы на свае канфесійныя арыентацыі, быць падрыхтаваным да ўспрыняцця твораў рэлігійнага мастацтва. Напрыклад, Сафійскі сабор у Полацку, царква Святога Духу ў Мінску, гравюры Скарыны да яго выданняў Біблііі, творы беларускіх мастакоў XIX ст. на біблейскія тэмы і многае іншае – яны належаць усяму народу і павінны паслужыць умацаванню яго ўзаемаразумення.

Глабалізацыйныя працэсы пачатку XXI ст. не ў стане зліквідаваць этнічна-культурныя адрозненні і самабытнасць духоўнага жыцця народаў. Па словах Ф. Кесідзі, глабалізацыя не ў стане нарадзіць новага чалавека, менавіта чалавека па-за дакладным этнасам і канкрэтнай цывілізацыяй, а таксама па-за тымі буйнымі этнасамі, у якіх гісторыя і культура тысячагоднія. Міленіум адкрывае перспектывы ўзбагачэння айчыннай культуры набыткамі іншых народаў, але гэта не значыць, што павінна знікнуць пачуццё айчыны. «Без пачуцця айчыны няма развіцця. Гэтае развіццё не ёсць простым інстынктам гнязда. Патрэбна высокая ідэя. Ідэя айчыны, нацыі… Што чакае людзей без пачуцця айчыны? Лёс сіраты. Сіраце дапамагаюць, але яе не любяць. Сірата спадзяецца на нейкі цуд…» [2, с. 154–155]. Сапраўдны, здаровы патрыятызм, прызнанне роднай культуры як улоння жыццядзейнасці, культ роднай мовы як фундамент духоўнага самаадчування ёсць важнейшыя ўмовы нацыянальнай ідэнтыфікацыі. Сама дзяржава без тытульнай нацыі – штучнае ўтварэнне, якое можа размыцца глабалізацыйнымі зменамі. Гэта стварае пагрозу для выжывання

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

народа ў супярэчлівым свеце, для яго цэласнасці і дабрабыту. Толькі ўласная лінія быцця ў спалучэнні з еднасцю з гістарычна роднаснымі народамі і культурамі дасць магчымасць пазбегнуць непажаданых біфуркацыйных хістанняў, усталяваць сваю сацыяльна-гістарычную самабытнасць.

Страта нацыянальнай ідэнтычнасці разрывае гістарычнае адзінства і цэласнасць існавання этнасу, што небяспечна парушае яго тоеснасць з выпрацаванымі формамі існавання. Страта каштоўнасных канструкцый, увасобленых у тым ліку і ў матэрыяльных аб’ектах і зносінах, вядзе да хаатызацыі сацыяльнасці ў цэлым, анеміі і разгубленасці. Нацыя страчвае сваю самасць, перастае быць сама сабою, яна ўжо не падмацоўваецца сваімі ж раней выпрацаванымі культурнымі, навуковымі, рэлігійнымі і іншымі дасягненнямі. І як следства – небяспека акультурацыі з іншымі культурамі і спосабамі сацыяльнага быцця не на парытэтнай аснове ўзаемаўзбагачэння, а на падставе запабягаючага ўспрыняцця чужых стандартаў.

Захаванне сваёй ідэнтычнасці дае народу магчымасць плённа абнаўляць свой жыццёвы патэнцыял, бо ўсё новае, запатрабаванае жыццём усталёўваецца тады, калі яно абапіраецца на трывалы падмурак духоўнай моцы, магутнасць калектыўнага духу нацыі.

1. *Козин, Н. Г.* Идентификация. История. Человек / Н. Г. Козин // Вопросы философии. – 2011. – № 1. – С. 37–48.

2. *Яновіч, С.* Без пачуцця айчыны няма развіцця / С. Яновіч // Беларусь – XXI ст.: нацыянальна-культурнае і духоўнае развіццё: матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 10–12 снежня 2003 г. / рэдкал.: Л. Уладыкоўская-Канаплянік [і інш.]. – Мінск: ННАЦ імя Ф. Скарыны, 2004. – С. 152–157.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ